ценности и эмоциональное состояние с помощью тщательного использования цвета, простоты и минимализма. Словно, игнорируя ненужные отвлекающие факторы, монохромные наряды, подчеркивающие важность мастерства, качества и намеренности, осуществляя их мощным заявлением против излишеств быстрой моды.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Хорошкевич Н.Г. Тенденции развития моды как социального института. Журнал «Гуманитарные, социально-экономические и общественные науки», № 9, 2024 г.

2. Костина В.С., Мозолёва Т.Е., Муравьева М.Е. Анализ современных медиатрендов России, Китая и Японии. Международный научный журнал «Вестник науки» №5 (74). Том 3, 2024 г.

3. Арнтцен М. Дресс-код. Голая правда о моде. Ad Marginem, 2017 г.

Каляга С.В., студэнт 350 групы
дзённай формы атрымання адукацыі
Навуковы кіраўнік – Лупашка І.Г.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

## ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА

У сучасных сацыякультурных умовах турызм становіцца адной з ключавых галін для эканамічнага росту, стварэння новых працоўных месцаў, прыцягнення інвестыцый, садзейнічае развіццю інфраструктуры, культурных

арганізацый. Таму неабходна ствараць сучасны канкурэнтаздольны турыстычны прадукт, выяўляць асаблівасці розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь.

Докшыцкі раён, які размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Віцебскай вобласці, валодае як прыродным, так і гісторыка-культурным патэнцыялам для развіцця турызму.

Адміністрацыйны цэнтр Докшыцкага раёна, г. Докшыцы, знаходзіцца побач з вытокам р. Бярэзіна. У раёне 274 населеныя пункты. Плошча Докшыцкага раёна складае 2267,61 км$^2$. Па стане на 01.01.2024 года на тэрыторыі раёна пражывала 20586 чалавек, у т.л. у горадзе Докшыцы – 6696 чалавек і г.п. Бягомль – 2405 чалавек [5, с.7]. Асновай мясцовай эканомікі з’яўляецца сельская гаспадарка.

На тэрыторыі Докшыцкага раёна размешчаны чыгуначныя станцыі ў аг. Крулеўшчына (ст. Крулеўшчызна), аг. Параф’янава (ст. Параф’янаў), на якія прыбываюць цягнікі з Мінска, Віцебска, Полацка, Брэста, Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Мурманска і іншых населеных пунктаў. У Докшыцкі раён можна дабрацца на аўтобусе, маршрутцы або асабістым аўтамабілі.

Усходняя мяжа гэтага рэгіёна знаходзіцца ў межах Верхнебярэзінскай, заходняя – Нарачана-Вілейскай нізінаў, на поўначы ляжаць Свянцянскія грады, на поўдні – Мінскае ўзвышша. Менавіта гэтым вызначаецца яго рэльеф, для якога характэрна спалучэнне раўнінных участкаў з узвышшамі.

Докшыцкі раён знаходзіцца на водападзеле басейнаў Балтыйскага і Чорнага мораў. Найбуйнейшымі рэкамі, якія працякаюць па тэрыторыі раёна, з’яўляюцца Бярэзіна, якая ўпадае ў Днепр, Вілія – прыток Нёмана, Поня і Сэрвач. Тут знаходзіцца 11 азёр: Сэрвач, Плаўна, Вольшыца, Межужол, Домашкаўскае, Станіслаўскае, Чорнае, Маскавіца, Камайскае, Медзазол, Манец, агульнай плошчай 1204 гектараў. Большасць азёр маюць ледавіковае паходжанне.

Амаль палова тэрыторыі раёна пакрыта лесам (46%), пераважаюць хваёвыя і бярозавыя лясы [3, с.19]. На тэрыторыі знаходзіцца частка Бярэзінскага

біясфернага запаведніка (40415 га). Створаны рэспубліканскія гідралагічныя заказнікі Верхневілейскі, Сэрвач, біялагічны заказнік Галубіцкая пушча.

Ёсць у Докшыцкім краі цікавыя помнікі прыроды. Сітцаўскі парк – узор садовапаркавага мастацтва XVII ст. На тэрыторыіі парка расце дуб-велікан. Гэты дуб – помнік прыроды рэспубліканскага значэння з 1963 года. Яго вышыня – 26 метраў, дыяметр ствала – 2 метры, узрост – амаль 500 год [2, с.13].

На тэрыторыі раёна размяшчаюцца ДП «Санаторый «Лясное» КДБ Рэспублікі Беларусь і ДУ «Санаторый «Баравое» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць значным патэнцыялам для развіцця аздараўленчага турызму, прапануюць шырокі спектр паслуг.

Прыродныя ўмовы Докшыцкага раёна ствараюць спрыяльнае асяроддзе для далейшага развіцця і ўладкавання месцаў для адпачынку не толькі грамадзян рэспублікі, але і замежных грамадзян.

На тэрыторыі раёна размешчаны ўстанова «Докшыцкая міжраённая арганізацыйная структура» РДГА «БТПР» і Бягомльскі лясгас, якія маюць паляўнічую гаспадарку. У в. Камайск на беразе возера размешчаны добраўпарадкаваны «Дом паляўнічага і рыбака» на 15 месцаў. Абсталяваны рыбалоўныя масткі і вальеры для ўтрымання дзікіх жывёл [4].

Такім чынам, асаблівасці фізіка-геаграфічнага размяшчэння Докшыцкага раёна ствараюць станоўчыя ўмовы для фарміравання такіх турыстычных напрамкаў, як пешаходны турызм, водныя прагулкі (сплавы па рэках), велавандроўкі, турыстычныя мерапрыемствы, звязаныя з разнастайнымі промысламі (рыбалоўныя, паляўнічыя, ягадна-грыбныя і інш.), экалагічны турызм, лячэбна-аздараўленчы турызм, агратурызм і інш.

Невялікая колькасць насельніцтва Докшыцкага раёна падводзіць да высновы, што намаганні па прыцягненні турыстаў і экскурсантаў павінны быць накіраваны на прыцягненне гасцей звонку. Гэтаму спрыяе дастаткова развітая

транспартная інфраструктура раёна. Наяўнасць прамысловых прадпрыемстваў дазваляе разглядаць магчымасць развіцця прамысловага турызму.

Гісторыка-культурны патэнцыял раёна ўключае помнікі археалогіі, архітэктуры, гісторыі, традыцыйнага мастацтва і інш.

На тэрыторыі Докшыцкага раёна размешчаны 12 курганных могільнікаў, 7 гарадзішчаў і 4 селішчы жалезнага веку, якія ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, як аб'екты III катэгорыі.

Дзейнічаюць больш за дваццаць храмаў, з іх 3 унесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Царква Праабражэння Гасподняга ў в. Порплішча – адзін з самых старажытных драўляных храмаў, які захаваўся да нашых дзён, пабудаваны ў 1627 годзе. Цікаўнасць прадстаўляюць алтары-кіоты царквы (1627, 1794 гг.).

Касцёл Яна Хрысціцеля пабудаваны ў 1884–93-х гг. з бутавага каменя і цэглы. З’яўляецца помнікам архітэктуры з элементамі псеўдабарока. Асаблівасцю кастёла з’яўляюцца інтэр’еры. У касцёле пяць драўляных алтароў, арган, скульптуры, ікона «Божая Маці з немаўлём» (1667).

Руіны царквы Усіх Святых (1866–1877 гг.) у Бягомлі помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Царква знаходзіцца ў дрэнным стане, цалкам абрынулася яе задняя сцяна. Але нават руіны храма выклікаюць моцнае ўражанне сваёй прыгажосцю і гармоніяй [1].

Сярод іншых культавых збудаванняў выклікаюць цікавасць храмы к. XIX–пач. XX стст. Падрабязней разгледзім некаторыя з іх.

Каменная царква вялікапакутніка Георгія Перамоганосца ў в. Сітцы пабудавана ў 1913 годзе. З'яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю і належыць да тыпу крыжова-купальных храмаў са званіцай.

Тумілавічская Свята-Георгіеўская царква, помнік народнага дойлідства, пабудавана ў 1864 годзе з дрэва. У храме знаходзяцца абразы 1901–1905 гг. «Маці Божая Нерукатворная», «Успенне», «Святыя Пётр і Павел».

Будаўніцтва Свята-Пакроўскай царквы пачалося ў 1900 годзе і было завершана ў 1903 годзе. Царква пабудавана ў цэнтры горада з бутавага каменя і цэглы. З'яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю [1].

У 1904 годзе быў пабудаваны мураваны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў вёсцы Параф'янава. Помнік архітэктуры неабарока.

Наяўнасць рэлігійных помнікаў у Докшыцкім раёне спрыяе развіццю рэлігійнага і гісторыка-культурнага турызму.

Існуюць на тэрыторыі раёна і помнікі сядзібна-паркавага мастацтва. У в. Сітцы захаваліся фрагменты парку і брамы пач. XVIII ст. Уязная брама з'яўляецца помнікам архітэктуры малых форм беларускага барока. Фрагменты парку і брамы ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, як аб'ект II катэгорыі.

Захаваліся фрагменты сядзіб ў вёсках Гняздзілава, Кіякова, Бярозаўка, Чаркасы. На жаль, сядзібы раёна знаходзяцца не ў лепшым стане [3, с.680].

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў раёне загінуў кожны трэці жыхар, фашысты спалілі 193 вёскі, у тым ліку 4 вёскі – Шунеўка, Азарцы, Залатухі, Баравые – спалілі разам з жыхарамі. «Праклён фашызму» – назва мемарыяльнага комплексу ва ўшанаванне памяці жыхароў в. Шунеўка. Мемарыяльны комплекс «Ходараўка» утвораны на месцы расстрэлу вязняў канцлагера «Лібараўшчына» і італьянскіх ваеннапалонных. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 12 брацкіх магіл [4]. Помнікі ўзведзены амаль у кожнай вёсцы. Мемарыялы, створаныя ў памяць аб загінуўшых і подзвігу савецкага народу ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сёння з'уяляюцца аб'ектамі ваенна-гістарычнага турызму.

Улічваючы ўнікальнасць гісторыка-культурных аб’ектаў, асаблівасці прыродна-геаграфічнага патэнцыялу, нядрэнную інфраструктуру Докшыцкага раёна, можна зрабіць наступныя высновы:

- Докшыцкі раён валодае турысцка-рэкрэацыйнымі рэсурсамі, якія ў дастатковай меры прывабныя для патэнцыйнага турыста (прыродныя рэсурсы, гісторыка-культурныя славутасці, аздараўленчыя рэсурсы);
- раён, за кошт свайго размяшчэння на скрыжаванні транспартных шляхоў, даступны для падарожнікаў;
- неабходна мэтанакіравана пашыраць інфармацыйную даступнасць і рэкламную прапанову, каб прыцягнуць увагу людзей да наведвання раёна.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Докшыцкі раён // Planeta BELARUS. – Мінск, 2019. – URL: planetabelarus.by/map/belarus/vitebskaya-oblast/dokshitskiy-rayon (дата звароту: 22.02.2025).
2. Палачанін, Ф.А. Докшыцкі край / Ф.А. Палачанін. – Мінск: Беларусь, 2009. – 181 с.
3. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2004. – 752 с.
4. Турызм у Докшыцкім раёне // Докшыцкі раённы выканаўчы камітэт. – Докшыцы, 2025. – URL: dokshitsy.vitebsk-region.gov.by/guests/turizm (дата звароту: 23.02.2025).
5. Численность населения на 1 января 2024 г. и среднегодовая численность населения за 2023 год по Республике Беларусь в разрезе областей, районов, городов, поселков городского типа: статистический бюллетень / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2024. – 30 с.